**Ластоўская, Р.** Незагойныя раны / Р. Ластоўская // Пастаўскі край. — 2009. — 4 лют. — С. 2.

# НЕЗАГОЙНЫЯ РАНЫ

Набліжаецца знамянальная дата – 20-годдзе з дня вываду войск з тэрыторыі Афганістана. У той дзень, 15 лютага 1989 года, з палёгкай уздыхнулі нашы воіны: яны пакідалі зямлю на якой правялі трывожныя дні, месяцы, гады, дапамагаючы афганскаму народу адстойваць дэмакратычныя заваёвы. З палёгкай уздыхнылі родныя, блізкія, знаёмыя тых, хто жывым вяртаўся дахаты. Слёзы радасці былі і на вачах людзей , чые сем'і не абпаліла тая далёкая вайна. Гэты дзень быў цяжкім для тых, чые дзеці, бацькі, мужы загінулі на чужой зямлі. У цынкавых трунах вярнуліся на пастаўскую зямлю яе сыны: Міхаіл Лапко, выпускнік нашай СШ № 2 Радзівон Мішута, Аляксандр Урбель.

Прайшлі дзесяцігоддзі, але не зажываюць раны ў сэрцах і душах родных гэтых хлопцаў. Маці, сёстры загінуўшых у Афганістане пастаўчан былі запрошаны ў наш музей на мерапрыемства, прысвечанае 15-годдзю вываду войск з ДРА. Запрасілі мы і маці Сяргея Галяка, які загінуў у Сірыі.

У экскурсіі «Воіны-інтэранцыяналісты» расказваем пра многіх землякоў, якія прайшлі тую далёкую вайну. Сярод іх і былыя вучні нашай школы: Андрэй Клянцэвіч, Ігар Чарэнка, Сяргей Пупкевіч, Сяргей Вайцяхоўскі, Міхаіл Гарлуковіч, Віктар Жукоўскі і іншыя. Асобны расказ ідзе пра Аляксандра Захаранку. Саша быў добрым вучнем, працавітым, цудоўным хлопцам. Прайшоў Афганістан, на радасць усім вярнуўся жывым дахаты. Працаваў шафёрам. У адным з рэйсаў адбылася трагедыя: Саша загінуў у аварыі. У маці ён быў адзіным сынам. Аднойчы яна прыйшла ў музей, прынесла афганскі берэт сына, кіцель, медаль «За адвагу», дакументы да яго, фотаздымкі і вось што сказала: «Я вельмі хворая, магу раптам памерці. Таму перадаю ўсе рэчы Сашы ў музей той школы, у якой вучыўся сынок. Я веру, што вы захаваеце памяць аб ім.»

Маці Сашы сапраўды памерла раптоўна, а мы захоўваем памяць пра яе сына і нашага былога вучня, расказваем аб ім экскурсантам. Усе рэчы Сашы экспануюцца ў нашым раздзеле музея. Толькі кіцель знаходзіцца ў запасніку. У час мерапрыемства прысвечанага 20-годдзю вываду нашых войск з Афганістана, кіцель будзе ў экспазіцыі. Цяжка мне даставаць яго, шчыміць сэрца, бо Саша – мой вучань.

А колькі іх, такіх юных, не падрыхтаваных да жыцця, загінула ў Афганістане. У раздзеле музея ёсць кніга «Памяць» – пра беларускіх хлопцаў і дзяўчат, якія вярнуліся дамоў «грузам-200». Балюча гартаць яе: амаль дзіцячыя твары, нявінныя вочы, у некаторых модныя на той час даўгія валасы… А ў іх родных па сённяшні дзень на сэрцы незагойныя раны.

13 лютага ў 13 гадзін у нашым школьным музеі пачнецца мерапрыемства, прысвечанае 20-годдзю вываду савецкіх войск з Афганістана. Нашы госці – былыя воіны-афганцы, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, школьнікі – убачаць экспанаты, якімі папоўніўся раздзел музея «Воіны-інтэрнацыяналісты», праслухаюць экскурсію. На гэты раз да двух нашых экскурсаводаў далучыцца трэці, бо мы падрыхтавалі матэрыял і экспанаты пра службу нашых землякоў на Кубе ў час Карыбскага крызісу. Таксама агучым матэрыял і прадставім экспанаты па тэме размініравання нашымі воінамі алжырскай тэрыторыі пасля вываду адтуль французскіх войск.

Вайна ў Афганістане засталася ў гісторыі. На ёй салдаты выконвалі загад. Прайшлі дзесяцігоддзі, але былым воінам і сёння сняцца «афганскія» сны. Мы не маем права дабаўляць чорныя фарбы ў іх душы.

**Р. Ластоўская**